Мікола Купава



...беларускасьць –

гэта чын жыцьця...

# Слава праз стагоддзі

***Зацемкі пра далёкае і блізкае***

## Як нашыя герб і сьцяг сталі дзяржаўнымі

У Беларусі шмат выдатных датаў, якія памятае і адзначае дэмакратычная грамадскасьць, якія дасьледуюцца беларускай навукай, якія ўвасабляюцца ў беларускай літаратуры і мастацтве: 26 студзеня, 2 лютага (Дзень перамогі пад Вулай і Воршай), 25 сакавіка, 15, 27 ліпеня, 8 верасьня і інш. У гэтым шэрагу павінен заняць сваё пачэснае месца і дзень 19 верасьня, калі ў 1991 годзе Вярхоўны Савет Беларусі ў якасьці дзяржаўных сімвалаў зацьвердзіў старажытны герб «Пагоня» і гістарычны бел-чырвона-белы сьцяг. На дзяржаўны пасад былі ўзьведзеныя нашыя спрадвечныя сімвалы, сотні разоў увасобленыя ў творах мастакоў на помніках юрыдычнай думкі, на грашовых сродках, адлітыя ў медзі, бронзе і срэбры.

Прыняцьце закону магло б і не адбыцца. Стала вядома, што ў верасьні парламент будзе разглядаць пытаньні пра дзяржаўныя сімвалы Беларусі, і Зянон Пазьняк прапанаваў творчай суполцы “Пагоня”, якая толькі што стварылася, арганіза-

ваць да гэтай сесіі ў Вярхоўным Савеце адмысловую выставу пра герб і сьцяг Беларусі.

У нашай групе працавала шмат мастакоў: Яўген Кулік, Віктар Сташчанюк, Уладзімір Крукоўскі, Віктар Маркавец, Хведар Ладуцька, Лявон Бартлаў, Леў Талбузін, Ігар Марачкін, фатограф Вячаслаў Дубінка. За кароткі час былі зробленыя эталонныя эскізы гербу і сьцягу, фотакопіі неабходных і недаступных гістарычных дакументаў, планшэты, вітрыны... Групу навукоўцаў, якія напоўнілі выставу арыгінальнымі экспанатамі, курыраваў прэзідэнт Акадэміі Навук Беларусі Уладзімір Платонаў. За некалькі дзён і за ноч з 18 на 19 верасьня ў фае Вярхоўнага Савету сабралі фундаментальную выставу – бальшыню ўсіх існуючых дакументаў адносна беларускай сімволікі, у тым ліку Статут і Трыбунал ВКЛ, копіі многіх гравюраў і карцін, шпалераў з выявамі беларускай сімволікі, медныя і срэбныя манеты, кераміка, пячаткі, паштоўкі з выявай гербу "Пагоня", шмат іншых рарытэтаў.

Каля дзевяці гадзінаў раніцы мы скончылі мантаж выставы. Фае пачалі запаўняць народныя дэпутаты. Мы ня бачылі таго ўражаньня, якое выклікала выстава, але ўяўляем тое дакладна па выніках сесіі. Выстава зьмяніла стаўленьне да беларускіх гістарычных сівалаў многіх дэпутатаў, якія па розных прычынах былі вельмі далёкія ад праблемаў культуры і гісторыі, але заставаліся здольнымі думаць і прымаць самастойныя рашэньні. Такія былі ў асяроддзі камуністаў і ветэранаў. Галасоў жа дэмакратаў для прыняцьця закону было недастаткова. Многія наогул упершыню бачылі і чулі праўдзівыя зьвесткі пра герб і сьцяг…

Вынікі ашаламілі. Камуністычны ў большасьці парламент прымае закон аб дзяржаўнай сімволіцы Беларусі і зацьвярджае ў якасьці дзяржаўных герб "Пагоня" і бел-чырвона-белы сьцяг.

На гімн не хапіла духу і настойлівасьці дэпутатаў і грамадства…

## Урокі Лявона Баразны

Знаёмства з Лявонам Баразной, якое доўжылася ўсяго некалькі гадоў, зрабіла пераварот у маім жыцьці, узбагаціла мяне духоўна, надало маім беларускім мроям рэальнае аблічча.

Упершыню я пачуў пра яго яшчэ падчас студыяваньня ў Менскай мастацкай вучэльні. У штодзённым жыцьці Лявон карыстаўся беларускай мовай. І гэты факт быў прадметам спрэчак і прычынай непрыняцьця яго касмапалітычнай калямастацкай публікай. Для мяне ж ён стаў інтрыгуючым, загадкавым і прыцягальным. Я зразумеў, што беларускасьць – гэта чын жыцьця, стыль паводзінаў, мараль, форма мысьленьня.

Нашая першая сустрэча адбылася ў ягоным службовым кабінеце ў Мастацкім салоне. Хоць гэта занадта гучна сказана – "кабінеце". Лявон працаваў галоўным мастаком у Мастацкім фондзе Саюзу мастакоў. Напэўна, было гэта ў годзе 1967-м. У тыя часы ў Мастацкім салоне ладзіліся персанальныя выставы, прадаваліся карціны, там жа месьціўся і Мастацкі фонд.

Кабінет нагадваў газетны шапік, і да Лявона трэба было зьвяртацца праз маленькае ваконца – як да касіркі ці прадавачкі газетаў. Я прыйшоў да мастака па нейкіх сваіх прафесійных справах. Спадар Лявон зрабіў тое, што было неабходна, а затым запытаўся, адкуль я родам. Я з гонарам адказаў, што з Воршы. Лявон ажывіўся, зазначыў, што мы з ім землякі…

У 1968 годзе я скончыў Менскую мастацкую вучэльню і працаваў у кінатэатры "Беларусь", а потым – на лікёра-гарэлачным заводзе "Крышталь". Менавіта гэты час стаў пераломным у маім жыцьці: я павярнуўся да Беларушчыны. Напрыканцы жніўня 1968 году купіў сваю першую беларускую кнігу. Пачаў чытаць Янку Купалу,

Якуба Коласа, Максіма Гарэцкага са слоўнікам. Але ў мяне не было нават знаёмых ці блізкіх людзей, з кім можна было б абмеркаваць беларускія праблемы. І я пачаў шукаць сустрэчы з Лявонам Баразной. Цяпер не прыгадаю ўжо, як даведаўся, дзе была Лявонава майстэрня. Дом меў усе прыкметы і дух XIX стагоддзя, асабліва лесьвіца. Гэта было так рамантычна!

Я пазваніў, і дзьверы мне адчыніла маладая жанчына – ягоная жонка Марыся. Я назваў сябе і спытаў, ці магу бачыць Лявона Баразну. З-за шырмы выйшаў Лявон, мы хутка знайшлі агульную размову…

Менавіта там я зразумеў, што любую ідэю трэба ажыцьцяўляць прафесійна. Толькі тады можна шмат чаго дасягнуць як у мастацтве, так і ў адраджэньні нацыі. Я тады многае зразумеў і вырашыў паступаць вучыцца далей у Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут. Аднойчы, калі быў ужо на другім курсе, Лявон пацікавіўся маімі працамі. Я запрасіў яго ў нашую інстытуцкую майстэрню. Лявону асабліва спадабаліся мае акварэлі, і ён параіў мне грунтоўна заняцца жывапісам.

Гэта была адна з апошніх нашых сустрэчаў. На разьвітаньне ён мне выказаў загадкавую думку пра тое, што Францішак Скарына апрача ўсяго быў мастаком. “Мастацтвазнаўцы дасьледавалі гэтую тэму і падрыхтавалі адпаведнае выданьне да друку”, – сказаў ён, не прамовіўшы пра тое, што гэта зрабіў ён сам.

Альбом выйшаў у 1972 годзе пасьля гібелі Баразны і стаў духоўным помнікам Лявону. А гравюры Скарыны занялі сваю спрадвечную нішу і ўяўляюцца тым апорным каменем у нашай культуры, які ўжо трывала ўдзірванеў у нашай мастацкай спадчыне...

## Дзякуй Івану Шамякіну

У 1968–1970-х гадах пасьля заканчэньня Менскай мастацкай вучэльні я працаваў на віна-гарэлачным заводзе “Крышталь” мастаком-аздабленцам, хоць афіцыйна быў залічаны як маляр вышэйшай кваліфікацыі пятага разраду. У штаце не было пасады “мастак”, а працы было занадта шмат: аздабленьне сьвятаў, клубу, урачыстыя пано, плакаты, надпісы. Усю візуальную інфармацыю выконваў па-беларуску. Каб я спыніў гэта рабіць, выкарыстоўвалі ўгаворы, пагрозы. Прыстаўленым да мяне чыноўнікам, які мусіў перавыхоўваць, быў парторг Латушка. Гэтак цягнулася да 1 кастрычніка 1970 году: у гэты дзень я з вялікай радасьцю пайшоў на заняткі ў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут...

Да паступленьня ў БДТМІ ў мяне ўжо была сям’я. Нарадзілася дачушка. Сям’ю трэба было ўтрымліваць, і я працаваў у некалькіх месцах. Апрача “Крышталю” пасьпяваў аздабляць кавярні, рэстаран “Менск”, іншыя «жывыя» пункты сталіцы. У летнія вакацыі 1971 году знайшоў сабе чарговую працу: трэба было аздобіць партыйны кабінет у Астрашыцкім Гарадку. У кампаньёны ўзяў прыяцеля і калегу – студэнта 3 курсу аддзяленьня “Інтэр’ер” Алеся Ступеню з Гародні. Афармілаўкай зноў кіраваў парторг: замаўляў партрэты Леніна, Маркса, Гагарына... Але тэматыку мы зьбеларушчылі на колькі маглі, у выніку ня толькі класікі марксізму-ленінізму загаварылі па-беларуску, але і Гагарын быў прывязаны да творчай біяграфіі Янкі Купалы, ды і самі Янка Купала з Якубам Коласам зьявіліся. Усё было зроблена цалкам па-беларуску. Мы працавалі, напэўна, больш за месяц.

Заказчыкі зьявіліся падчас завяршэньня працы: парторг і дырэктар саўгасу (расеец). Дырэктар, разумеючы далікатнасьць сітуацыі, маўчаў. Парторг жа пайшоў у наступ: “Зачэм!? Пачаму?! Хто вам разрашыл?! Мы здесь столька сіл патрацілі, штобы последнюю беларускую школу закрыць! А вы нам тут што зделалі?! Всё немедленно перепісаць! Пока не перапішэце на русский язык – не палучыце аплату!” Так і ў пагадненьне ўпісалі: “Все тексты произвести на русском языке”...

На наступны дзень мы разьехаліся да сваіх бацькоў: я – у Воршу, Алесь – у Гародню, дамовіўшыся, што я пра ўсё напішу Уладзіміру Караткевічу. Ад Караткевіча вельмі хутка прыйшоў адказ. Пісьменьнік раіў мне зьвярнуцца са скаргай да старшыні Вярхоўнага Савету Беларусі Івана Шамякіна, напісаць яму пра гэты канфлікт. Я так і зрабіў. А ў канцы верасьня, калі скончыліся вакацыі, вярнуўся ў Менск. І во дзіва! Мне тэлефануе той самы парторг і кажа: «Можаце прыехаць і палучыць сваі дзеньгі ў касе...».

Пры сустрэчы парторг, не хаваючы злосьці, кінуў нам: «Долга эта не павісіт, мы скора ўсё эта выкінем, как толька прыдёт урэмя». І я ўявіў, як будуць выкідваць свайго Маркса і Леніна... На пераломе 60-х–70-х гадоў у Астрашыцкім Гарадку дзеля ліквідацыі беларускай школы, паводле ўласнага прызнаньня, прыклалі намаганьні парторг Мыцько і, напэўна ж, дырэктар саўгасу “Новый путь” Маісееў. Спыніць іх магла толькі **сапраўдная беларуская ўлада**, якая ў асобе Івана Шамякіна, тагачаснага «спікера», і паўстала на іхнім шляху. Такая ўлада магла б нават перавыхаваць прадстаўнікоў разьвітога сацыялізму.

Я атрымаў невялікую, але такую неабходную перамогу. І няважна, што гэта быў “кабинет политического просвещения”...

## Як мы ратавалі першы Менскі гарадскі тэатр

Прайшло больш двух дзесяцігоддзяў, як улады Менску чыгуннай бабай разьбілі рэшткі будынка першага гарадскога тэатру. Ён быў дарагі для нашай культуры сваёй асаблівай гісторыяй. Менавіта тут у 1852 годзе была ўпершыню пастаўленая аперэтка Дуніна-Марцінкевіча, Манюшкі ды Крыжаноўскага “Сялянка”. З гэтым будынкам зьвязаная дзейнасьць Людвіка Кандратовіча, Камілы і Міраслава Марцінкевічаў, многіх іншых дзеячаў беларускай культуры сярэдзіны XIX ст.

Будынак доўгі час стаяў без капітальнага рамонту, што і прывяло яго да аварыйнага стану. А да ўсяго – будаўніцтва метрапалітэну...

Некалі планавалася рэканструкцыя ўсяго Верхняга гораду, неад’емнай часткай якога зьяўляўся тэатр. Але ў 1984 годзе адбылося адвольнае абвальваньне муроў будынку. Гэта прымусіла актывістаў беларускай культуры прымаць дзейсныя захады па выратаваньні рэшткаў тэатру. Пісаліся адпаведныя лісты, адбыўся візіт да Івана Антановіча – загадчыка аддзела культуры ЦК КПБ. Ён быў вымушаны прыняць групу прадстаўнікоў беларускай культуры, у склад якой уваходзілі Яўген Кулік, Міхась Чарняўскі, Міхась Ткачоў, Зянон Пазьняк, Аляксей Марачкін ды іншыя... Антановіч паводзіў сябе разьвязна, груба і, галоўнае, нікога ня слухаў. Галоўным аргументам супраць тэатру было прозьвішча былога ўладальніка будынку на Зборавай – Саламонаў. Логіка жалезная. Аднак Антановіч пакінуў нам адзін шанец, сказаўшы: “Калі вы дакажаце, што будынак тэатру сапраўды зьяўляецца каштоўным помнікам, я першы падстаўлю плячо пад яго!”

13 чэрвеня 1984 году а 21 гадзіне мне пазванілі: “Пачалі бурыць будынак тэатру на Полацкіх валоках (вуліца, якой бальшавікі прычапілі назву Інтэрнацыянальная, мела гістарычную назву Полацкія валокі – з аднаго канца, і Зборавая – з другога). Адклаўшы ўсе справы, я, патэлефанаваўшы Марачкіну, паехаў на месца злачынства. Тэатр абнесьлі плотам, і да яго можна было падысьці толькі з двух бакоў: ці ад будучага праспекту Скарыны, ці ад Верхняга гораду. Працаваў аўтакран, які чыгуннай бабай ператвараў помнік у друз і пыл. Мы пратэставалі, да нас яшчэ нехта далучыўся, пакуль нас не адцясьнілі міліцыянты. Праўда, ніякіх пратаколаў не складалі...

Назаўтра раніцай я вырашыў званіць у Маскву ў ЦК Зімяніну. Усё ж наш зямляк. Цяпер я не магу дакладна сказаць, як звалі гэтага чалавека, а тады ж знайшоў ягоны тэлефон, дазваніўся і ў эмацыйнай форме выклаў сэнс праблемы. На другім

канцы дроту ў Маскве чалавек спытаў: “Як да гэтай праблемы ставяцца Аляксандр Трыфанавіч (сакратар ЦК КПБ Кузьмін) і Іван Іванавіч?” “Дык вось жа так і ставяцца, дом жа бурацъ не бяз іхняй згоды,”– адказаў я. Чалавек, тым ня менш, паабяцаў “нешта зрабіць”. А калі я вярнуўся да тэатру, дык убачыў, што ўжо няма чаго ратаваць: старанны трактарыст заканчваў сваю працу. А вялікія самазвалы цэлы тыдзень вывозілі рэшткі будынка за горад. Самазвалы вывозілі цэглу і друз, і разам з імі – нашую культуру, наш гонар, нашую памяць, – на звалку.

## Мая Вільня

У маё жыцьцё і творчасьць Вільня ўвайшла трывала і назаўсёды. Але напачатку было знаёмства і вывучэньне места. У 1974 годзе, улетку, адбылася адмысловая экскурсія-вандроўка на аўтобусе, наладжаная Генадзем Сакаловым-Кубаем, дасьледчыкам і знаўцам Вільні.

Вандроўка адчыніла дзьверы ў нашую гісторыю, дала магчымасьць дакрануцца да падмуркаў беларускай культуры. У наступныя гады вывучэньне Вільні працягвалася. Мы сустракаліся са слыннымі дзеячамі беларускага руху ў Вільні Зоськай Верас, Янкам Багдановічам, Антонам Антановічам, Паўлам Карузам, Лявонам Луцкевічам, Пётрам Сергіевічам. Самыя частыя візіты былі да Зоські Верас і Пётры Сергіевіча. Зоська Верас, асоба легендарная і рамантычная, жыла ва ўласным доме, які збудаваў ейны муж Антон Войцік. Прастаяла хата роўна 50 гадоў, пакуль не згарэла з усім начыньнем у 1989-м. Падобна, што падпалілі яе зламысьнікі. У Зоські Верас былі багаты сад і аранжарэя з цяпліцай. Там расьлі ўнікальныя гатункі кветак, дрэваў, папараці, кітайскія, японскія, галандскія ружы, цытрыны, лаўр, арэхі... Кветкамі займалася Галіна – дачка гаспадыні, а ў цяпліцы працаваў Ярослаў, сын Галіны, і Лявон, ейны муж. Зоська Верас распавядала пра сябра Максіма Багдановіча, пра Менск, пра Вільню, пра Віленскі беларускі музей Луцкевічаў і шмат пра што іншае.

Аднаго разу я прывёз у Вільню сваю старэйшую дачку Ірыну. Прыйшлі да Зоські Верас на начлег. Падворак быў абнесены высокім плотам. На падворку жыў сабака – аўчар па мянушцы Ас. Мы ўбачылі, што ён напалову спаралізаваны: задняя частка з лапамі цягнулася, а перасоўваўся небарака толькі на пярэдніх лапах. Мы пераначавалі, а раніцай не знайшлі Аса: ён нейкім чынам перагрыз ашыйнік, пералез праз плот і папоўз у лес паміраць...

Упершыню тэма Вільні мною была ўвасоблена ў графічным аркушы «Вільня. Вострая Брама» з альбому «Шляхамі Янкі Купалы». У альбом уваходзіла некалькі лінарытаў з выявамі тых мясьцінаў, якія былі зьвязаныя з жыцьцём і творчасьцю Янкі Купалы. У Віленскі сюжэт закампанаваная Вострая Брама з гербам Пагоня на партале і фрагмент абарончага муру: касьцёл сьв.Тэрэзы і касьцёл сьв. Казіміра, справа ад помнікаў удалечыні ўзвышаецца гара Гедыміна і рэшткі замку вялікіх князёў. У верхнім правым куце лінарыту зьмешчаны герб Вільні – сьвяты Крыштуп.

У 1980 годзе Беларусь адзначыла 500-гадовы юбілей ад часу нараджэньня вялікага паэта-лаціністa Міколы Гусоўскага, аўтара неўміручай паэмы «Песьня пра зубра». У сувязі з гэтай падзеяй Беларускі саюз мастакоў арганізаваў выставу «Мікола Гусоўскі і яго час». Да выставы я стварыў кампазіцыю «За радкамі паэмы». Твор складаецца з трох частак: у цэнтры – сам паэт на асноведзі Рымскага краявіду, а ў правай кампазіцыйнай частцы – сцэна з вайсковага жыцьця Вялікага князя Вітаўта, якая разгарнулася ля падножжа Віленскага замку.

У 1983 годзе я атрымаў заказ ад Літаратурнага музею Якуба Коласа стварыць серыю літаграфіяў на тэму жыцьця і працы Якуба Коласа ў Вільні. Маёй задачай было занатаваць тыя мясьціны, якія былі канкрэтна зьвязаныя з дзейнасьцю вя-

лікага песьняра. У поле майго зроку трапілі будынкі, дзе рэдагаваліся, ствараліся і друкаваліся першыя беларускія газеты, дзе працаваў і жыў Якуб Колас. У нялёгкай дасьледніцкай справе мне вельмі дапамагаў навуковы супрацоўнік музею паэт Генадзь Тумаш. Мы з ім ня раз езьдзілі ў Вільню, каб пасьля ягоных архіўных і краязнаўчых росшукаў на месцы выявіць неабходныя аб'екты, ідэнтыфікаваць іх і зафіксаваць – зрабіць замалёўкі і сфатаграфаваць.

Так пазьней узьнікла серыя каляровых літаграфіяў "Будынак, дзе з 1 верасьня па 1 сьнежня 1906 году знаходзілася рэдакцыя першай беларускай газеты «Наша Доля» на вуліцы Віленскай, 32", "Будынак, дзе знаходзілася друкарня, у якой друкавалася газета «Наша Доля», на рагу вуліцаў Вялікай і Рудніцкай", "Будынак друкарні Марціна Кухты на вул. Палацавай, 4, у якой друкавалася газета «Наша Ніва» і шмат іншай беларускай літаратуры", "Будынак, у якім у 1907 г. знаходзілася рэдакцыя беларускай газеты «Наша Ніва», калі ў ёй працаваў Якуб Колас, рог вуліц Завальнай і Троцкай, 30".

Апошні будынак для нас шмат у чым каштоўны і памятны. Гэта палац беларускіх гісторыкаў, навукоўцаў графоў Канстанціна і Астаха Тышкевічаў. У 1884-1894 гадах там месьціўся акруговы суд, і там працаваў Францішак Багушэвіч. А ў 1907-м у рэдакцыі газеты «Наша Ніва» працаваў Якуб Колас...

У 1986-1988 гадах былі створаныя два аркушы з падтэмай «Віленская чыгуначная калонія». У прадмесьці Вільні ў 10-я гады XX ст. дзейнічала калонія для працаўнікоў Лібава-Роменскай чыгункі. Была выдзеленая вялікая тэрыторыя пад будаўніцтва дамоў для служачых і працаўнікоў чыгункі. Там збудавалі дом бацькоў Марыі Каменскай, у будучым нявесты і жонкі Якуба Коласа. Калі ў 1912 годзе паэт ажаніўся з Марыяй, пэўны час маладая сям'я жыла там. На другім паверсе быў кабінет Якуба Коласа. У 1960-х гадах урадам Літоўскай Рэспублікі было прынятае рашэньне аб стварэньні ў тым доме музею Якуба Коласа. Але праз некалькі гадоў дом быў разабраны, і на гэтым ягоная гісторыя скончылася. Засталася каляровая літаграфія "Дом Марыі Каменскай у Віленскай чыгуначнай калоніі – рэканструкцыя будынку і навакольнага асяроддзя". У 1986 годзе я яшчэ бачыў там на пустцы складзенае бярвеньне дому... Шкада, што беларусы-віленчукі не дамагаліся і не дамагаюцца адбудовы гэтага ўнікальнага для беларускай культуры помніку, сьведкі беларускай прысутнасці ў Вільні…

Асваеньне Вільні працягвалася. У 1987 годзе я аздабляў Энцыклапедычны даведнік «Францыск Скарына і яго час». Асновай фаліянту сталі застаўкі, з якіх пачыналіся разьдзелы. У аздабленьні розных ініцыялаў і сюжэтаў я намаляваў Вільню агулам пяць разоў.

Від Вільні XVII стагоддзя я падаў на вокладцы кнігі А.Цітова «Гарадская геральдыка Беларусі» – пад гербам Вялікага Княства Літоўскага «Пагоня». У выдавецтве "Полымя" гэта выклікала страшэнны перапалох і даволі працяглую барацьбу галоўнага рэдактара Іванова супраць маёй ідэі. Але я ня стаў нічога мяняць. А калі кніга выйшла, я ўбачыў над Вільняй у тым жа шчыце касыя бел-чырвона-белыя палосы. Хто гэта зрабіў, я ня ведаю. Але Іваноў сам сябе перахітрыў, бо бел-чырвона-белы сьцяг для апанентаў беларускай гісторыі і культуры быў яшчэ страшнейшым за «Пагоню».

Вобраз Вільні неаднаразова выкарыстоўваўся мной у аздабленьні кнігі М. Арочкі "Судны дзень Скарыны". А ў 1996 годзе ў выніку захапленьня тэмай паўстаньня Касьцюшкі я зрабіў акварэльны трыпціх «За волю, роўнасьць, незалежнасьць». Ідэя кампазіцыі – росквіт дзяржавы, увасоблены ў вобразах дзьвюх сталіцаў Вільні і Менску, над якімі навісла сьмяротная небясьпека. Да 650-х угодкаў Вітаўта Вялікага зьявіўся акварэльны партрэт «Вітаўт»: леваруч ад постаці Вялікага князя – выява Віленскага вялікакняжацкага Верхняга замку...

Вільня ў маёй творчасьці – працэс працяглы, пастаянны. Спадзяюся, што на-

перадзе яшчэ будуць цікавыя сустрэчы з маёй Вільняй, што і надалей буду ўмацоўвацца жыватворным вобразам, у якім жыве і праменіць нашая Багіня – Маці Божая Вострабрамская. Гэтага хопіць на ўсё творчае жыцьцё.

## Падпольная школа – падпольнае жыцьцё

Ужо ў 1970-х гадах у сталіцы Беларусі, як, бадай, і ва ўсіх гарадах краіны, не заставалася ніводнай беларускамоўнай школы. Толькі ў вёсках яшчэ дзенідзе працавалі школы з беларускай мовай навучаньня.

У 1976 годзе мы арганізавалі ліст з просьбай стварыць беларускі клас і даслалі яго тагачаснаму міністру адукацыі. Падпісантамі былі каля 15 чалавек, у каго дзеці ішлі ў першы клас. Але, як і трэба было чакаць, мы не атрымалі ніякага адказу...

Толькі ў 1980 годзе ў садку Г. Прымы арганізавалі першую беларускую групу, і паступова садок быў зьбеларушчаны. А ў 1984 годзе ў Менскай школе № 108 пачаў працу першы беларускі клас. Ад гэтага часу бярэ адлік гісторыя першай сучаснай беларускай школы ў сталіцы Беларусі. Хто мог, як мог дапамагаў садку і школе выстаяць і ўзмацнець. Мастакі падарылі вялікую калекцыю сваіх твораў, праводзілі сустрэчы і гутаркі з дзецьмі. Я цэлы год выкладаў выяўленчае мастацтва...

У 1976 годзе Беларускае Адраджэньне было далёкай марай. Нашыя дзеці хадзілі ў савецкія школы, разам з імі вучыліся і мы: імкнуліся перавучваць або давучваць іх у тых галінах ведаў, якія былі асабліва сфальшаваныя савецкай навукай, аўтарамі падручнікаў. Само сабой насьпела пытаньне аб стварэньні непадкантрольнай, нефармальнай школы (класу), дзе мы маглі б калектыўна вырашаць праблемы нацыянальнай адукацыі. Гэтыя функцыі магла выконваць толькі падпольная школа. Асновай яе стаў мой гурток выяўленчага мастацтва, які я вёў ад 1979 году. Вучнямі былі дзеці нашых сяброў: Каця Баразна, Віця Корзун, Андрэй Тумаш, Аксана Содаль, Зьміцер Маркавец, Іра Купава, Кастусь Санька. Я з дзецьмі займаўся выяўленчым мастацтвам, гісторыяй культуры, мастацтва, гісторыяй. Генадзь Тумаш вёў беларускую мову, культуру мовы, гісторыю. Асобныя тэмы, якія былі важныя ў сістэме нацыянальнай адукацыі, выкладалі іншыя сябры нашага класу. У 1979-80 гадах я са сваім гуртком месьціўся ў невялічкай майстэрні на плошчы Перамогі, а да 1982 году ў інтэрнаце заводу «Інтэграл». Важнае месца ў нашай працы займалі вандроўкі па Беларусі. Мы наведалі выдатнага народнага майстра Палінара Пупку. Палінар Фларыянавіч дэманстраваў свае новыя творы і тыя, якія ўжо даўно былі ўсталяваныя на ягоным падворку, шмат апавядаў. Івянецкія помнікі архітэктуры – баракальны і новагатычны касьцёлы – стваралі адпаведны эмацыйны настрой нашага падарожжа. Вязынка, Акінчыцы, Мір, Крэва, Гальшаны, Вільня – няпоўны пералік цудоўных мясьцінаў нашай Бацькаўшчыны, якім мы аддавалі свае сэрцы і ўражлівую памяць юных падарожнікаў.

Мы далучалі дзяцей да ўсіх нашых беларускіх спраў ды імпрэзаў на ніве культуры, мастацтва. Так, у 1980 годзе мы ўрачыста адзначылі 80 гадовы юбілей вялікага беларускага сьпевака Міхася Забэйды-Суміцкага. У вечарыне прынялі ўдзел мастакі, пісьменьнікі, навукоўцы, журналісты. У навуковай акадэміі выступалі дасьледчыкі, біёграфы, артысты, навукоўцы, гучалі песьні ў выкананьні песьняра, былі разгорнутыя дакументальная і мастацкая выставы. Факт сьвяткаваньня стаў вядомы і Міхасю Іванавічу. Гэта прыдало яму неабходнай энергіі ды радасьці.

А мы раптам заўважылі, што ўсё нашае жыцьцё праходзіла ў падпольлі. Да 1991 году было яшчэ далёка…

## Брыкяці, або на пленэры імя Язэпа Драздовіча

Творчая супола “Пагоня” правяла ўжо 6 пленэраў імя Язэпа Драздовіча на радзіме мастака. Кожны пленэр – гэта асваеньне новых мясьцінаў, новыя адкрыцьці і, вядома ж, новыя творы, якія малюем з незвычайнай асалодай. Пленэры праводзілі летам, восеньню і нават зімой.

Глыбоцкі край – радзіма мастака – зямля незвычайнай прыгажосьці. Учора мы наведалі Пунькі, родны засьценак Драздовіча, які прытуліўся скрай Галубіцкай пушчы. На гэтай зямлі цяпер жыве адзін бабыль Артур са сваім канём, каровамі, бычком, сабакамі, авечкамі, катамі, курамі, парсюкамі. Амаль усе яны бываюць у ягонай хаце. Артур сьцеражэ памяць пра былых гаспадароў, хоць ад Драздовіча тут толькі дзьве памяткі: ліпа і крыніца.

Мы едзем з Падсьвільля на гару Брыкяці. Падсьвільле – вельмі маляўнічае мястэчка вакол возера Пліса. У возера ўпадаюць дзьве рэчкі: Сьвіліца, даўжынёй усяго 10 км, цячэ з паўднёвага захаду, і Шоша, якая пачынаецца з возера Шо і мае даўжыню ажно 30 км. Праехалі возера Белае, якое адразу за Плісай. (У Глыбоцкім раёне ажно 4 возеры з назвай Белае.) Апынуліся ў лесе, які тут жа за возерам і пачынаецца. Лес пясьцёры, бо апрача залатых і чырвоных дрэваў вельмі часта трапляюцца вечназялёныя. “Вось мы ўжо ва ўрочышчы Брыкяці”, – тлумачыць нам спадарыня Людміла – дырэктарка мясцовай турбазы, нашая правадніца і гід. А з урочышча і пачынаецца ўзыходжаньне на гарадзішча, якое таксама завецца Брыкяці. Мы ўжо знаходзіліся на падэшве ўзвышша, справа ад нас – нізіна, і нашая задача – падняцца на самую гару, якую абмывае нам ужо вядомая рэчка Сьвіліца. Вузенькая сьцежка вядзе на гару – 40 метраў ад падножжа. Атрымліваецца даволі ўнушальная вышыня паводле нашых беларускіх мерак. Спадарыня Людміла кажа, што тут некалі было гарадзішча. Праўда, ніякіх сьлядоў раскопак не відаць. А само гарадзішча ўяўляе сабою мыс, насавая частка якога скіраваная на поўдзень, і гэты нос у самым пачатку зусім вузкі – з метр. На схіле гары дрэвы трымаюцца за зямлю голымі каранямі, падпіраючы ўзлобак. Дрэвы падмывае рэчка. Сама ж гара густа парасла дрэвамі. Зялёныя высачэзныя елкі з гірляндамі чырвоных шышак, якія гараць на сонцы… Зялёна-шэрыя вольхі, мякка-вохрыстыя кустоўі, залацістыя бярозкі з асьляпляльна белымі бакамі. Крыху воддаль ад іх прысуседзіліся вохрыста-залацістыя асіны. Манументальныя, вохрыста-карычневыя ліпы, чырвоныя кусты каліны і брызгліны. Нахабна-жоўтыя, з выклікам усім, стаяць рэдкія кашлатыя клёны. Магутныя дубы і дубкі не сьпяшаюць зьмяніць зялёны ўбор. Толькі лёгкая пазалота кранула іх магутныя шаты. Сваім упартым пастаянствам – вечназялёным убраньнем – зьдзіўляюць маладыя хвоі.

Я апынуўся ў казачнай краіне Брыкяці. Блакітнае неба з рэдкімі белымі аблокамі, зыркае сонца, якое шчодра грэе зямлю і залаціць усё наўкола. Крычу ўдалячынь: Бры-кя-ці!.. Што гэта такое – Брыкяці? Брыкяці пад нагамі, у небе, у лесе, у вадзе. Гэта ўсё Брыкяці. Гэта толькі што спазнаны цуд, але не раскрыты да канца. Спускаюся ўніз, ня хочучы разьвітвацца з казкай. Сьвіліца, Пліса, Шоша і недзе недалёка Шо. Яны – як акварэль – мякка, празрыста, сакавіта і густа кладуцца на вільготную паперу…

## Слава Воршы праз стагоддзі

Так назвалі мастацкую выставу арганізатары гэтага незвычайнага вернісажу. 2004 год быў знамянальны для Беларусі 490-мі ўгодкамі перамогі пад Воршай. Да гэтай даты Нацыянальны аргкамітэт падрыхтаваў і правёў шэраг мерапрыемстваў: была створаная навукова-дасьледчая і выдавецкая групы, якія займаліся вывучэньнем, дасьледаваньнем і абагульненьнем навуковых матэрыялаў, праведзеная канферэнцыя з удзелам вядомых беларускіх навукоўцаў, мастацтвазнаўцаў, кра-

язнаўцаў, якія грунтоўна высьветлілі многія пытаньні і праблемы вялікай гістарычнай і батальнай падзеі ў Беларусі. У верасьні была адкрытая дзіцячая выстава-конкурс “Аршанская слава”, якую падрыхтавалі юныя мастакі з многіх мясьцінаў Беларусі, а ў сьнежні на Каляды адкрылі мастацкую выставу “Слава Воршы праз стагоддзі”.

Да тэмы бітвы пад Воршай у розныя гады зьвярталіся многія беларускія мастакі: Гаўрыла Вашчанка, Уладзімір Стальмашонак, Міхась Басалыга, Генрых Ціхановіч, Анатоль Волкаў. Экспазіцыю прымеркавалі да завяршэння вайсковай кампаніі 1514 году і трыумфальнага ўваходу Астрожскага ў Вільню.

Пасьля перамогі пад Воршай яшчэ заставаліся акупаванымі Смаленск, Амсьціслаў і Прыдняпроўе. Баяры Найвышэйшага гетмана вызвалілі ад ворага Дуброўну, Амсьціслаў, Крычаў. На Смаленск не хапіла сілаў…

“Гетман Канстанцін Астрожскі ў Вільні”– назва працы Людмілы Красьнеўскай-Кашкурэвіч. Сустрэча нацыянальнага героя ў сталіцы пасьля паўгадавой вайсковай ратнай службы дзеля дзяржавы і народу. Твор па-народнаму цёплы і прыгожы, выяўляе адпаведнасьць задумы і кампазіцыі.

Народны мастак Беларусі Арлен Кашкурэвіч паказаў два бліскучыя графічныя аркушы “Вялікая каралева і княгіня Бона” ды “Князь ВКЛ Жыгімонт I Стары”. Вядома, што Жыгімонт на час вайсковых падзеяў пакінуў абедзьве сталіцы і знаходзіўся ў сваёй стаўцы ў Барысаве (недалёка ад Воршы) з ахоўнымі войскамі. Учынак кіраўніка Дзяржавы патрыятычны і абсалютна станоўчы. Зварот мастака да вобразу Жыгімонта і Боны значна пашырае тэматыку выставы, напаўняе яе новым зьместам.

Іван Пратасеня рэпрэзентуе кампазіцыю “Дружына слуцкага княжыча Юрыя”, якая сьведчыць аб тым, што ўся краіна паднялася на вайну з захопнікамі.

Падобная тэматыка і ў маёй акварэлі “Паспалітае рушаньне ў Гародні”. На аснове манументальнага гарадзенскага краявіду з замкам Вітаўта праз Нёман па мосьце рушылі мясцовыя рыцары пад гербам Палоні на Воршу. Была на выставе і мая «Аршанская бітва» складанай, шматфігурнай, арыгінальнай кампазіцыі, выкананая ў няпростай тэхніцы акварэлі. У цэнтры кампазіцыі – Найвышэйшы гетман Астрожскі з вайскаводцамі ў апошнія хвіліны перад боем. За Аршанскім замкам ідзе пераправа нашых войскаў. Яны ўсьцяж левага берагу Дняпра рушаць на высозныя пагоркі да гетмана. На пярэднім плане замаскаваныя гарматы і самі артылерысты, гатовыя да атакі...

Мастачка Антаніна Лапіцкая нагадала, што першая чвэрць XVI стагоддзя ў ВКЛ была, апрача войнаў і перамогаў, эпохай вялікіх культурных зьдзяйсьненьняў. Аб тым гавораць яе акварэльныя партрэты Ф.Скарыны і К.Астрожскага-сына.

Арыгінальнасьцю запамінаюцца выцінанка Ніны Сокалавай-Кубай «Бітва», габелен «Цішыня ў часе» Вольгі Быстровай, элегія Лявона Грышука «Разьвітаньне з аршанскім рыцарам» (кроў і палатно, якім накрылі ваяра, паўтарылі абрысы беларускага сцягу).

Князь, кашталян, сенатар Паноў-Рады, Найвышэйшы гетман – такія зямныя рэгаліі Канстанціна Астрожскага, які, як вядома, у сталым веку памёр у Тураве. Але ў сьвядомасьці ягоных нашчадкаў ён – бесьсьмяротны. Ён герой на ўсе часы. І мастак з Гомелю Генадзь Говар паказаў Астрожскага як рыцара, гатовага зноў выступіць у паход («Непераможны князь К.Астрожскі ў Тураве»).

Аршанскія энтузіясты прапаноўвалі адчыніць выставу ў Воршы, але знайшліся начальнікі над мясцовымі начальнікамі, якія таго не дазволілі. У Менску ж і кіраўнікам Беларускага саюзу мастакоў, і кіраўнікам галерэі Беларускага саюзу кінематаграфістаў не хапіла сьмеласьці разьмясьціць тую выставу на сваіх плошчах.

Вернісаж адбыўся ў галерэі з сімвалічнай назвай «Вільня» на вуліцы Каліноўскага-55. Давялося зьмяніць назву: каб у ёй словаў Ворша, бітва пад Воршай і блізка не было…